Как следует из рассмотренных примеров употребления, действие рока проявляется в неблагоприятных для человека стечениях обстоятельств, их неизбежности и предопределённости. Судьба, представленная как *рок*, подразумевает нечто фатальное, неподвластное воле человека. Эта предопределённость, неотвратимость, безысходность вызывают чувство тревоги и бессилия человека перед лицом рока, которые естественным образом ассоциируются с негативными эмоциями. Поэтому такие сочетания, как *злой рок, неумолимый рок, жестокий рок* означает, именно эту неблагоприятную, предопределённую и часто трагическую сторону судьбы. Отсутствие контроля над ситуацией, заложенное в самом понятии *рока*, делает его мощным символом для выражения негативных событий и переживаний. Рассмотренный нами языковой материал позволяет сделать вывод о том, что рок осмысляется как слепая, деструктивная сила, противостоящая человеческой воле.

## Литература


1 Гак, В. Г. Сочетаемость / В. Г. Гак. // Языкознание. Большой энциклопедический словарь. / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М. : Большая Российская энциклопедия, 1998. – С. 483.

2 Арутюнова, Н. Д. Метафора / Н. Д. Арутюнова. // Языкознание. Большой энциклопедический словарь. / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М. : Большая Российская энциклопедия, 1998. – С. 296–297.

3 Ожегов, С. И. Словарь русского языка / под ред. Н. Ю. Шведовой. – 17-е изд., стереотип. – М. : Русский язык, 1995. – 796 с.

4 Словарь русского языка: в 4-х т. / АН СССР, Ин-т рус. яз.; под ред. А. П. Евгеньевой. – 3-е изд., стереотип. – М. : Русский язык, 1985–1988. – Т. 3. П – Р. 1987. – 752 с.

5 Национальный корпус русского языка. – URL: https://ruscorpora.ru/new/ (дата обращения: 12.04.2025).



**УДК 373.5.091.3:821.161.3-3*М.Зарэцкі**



***Г. А. Іванюк***


# СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ М. ЗАРЭЦКАГА Ў СУЧАСНАЙ ШКОЛЕ


*Артыкул, прысвечаны вывучэнню творчасці Міхася Зарэцкага ў сучаснай школе, адлюстроўвае асноўныя метадычныя падыходы, якія настаўнік можа выкарыстаць пры выкладанні тэмы ў 10 класе. Аўтар прыходзіць да высновы пра неабходнасць напаўнення ўрока сучаснымі прыёмамі і формамі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, паколькі зварот да творчасці пісьменніка школьнай праграмай прадугледжаны толькі адзін раз, і гэтае знаёмства павінна стаць запамінальным.*


Знаёмства з творчасцю М. Зарэцкага прадугледжана школьнай праграмай па літаратуры толькі адзін раз – у 10 класе ў раздзеле “Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя”. На гэтым уроку трэба разгледзець цэлы шэраг пытанняў: “Міхась Зарэцкі. Апавяданне «Дзіўная». Звесткі пра жыццё і творчасць. Адлюстраванне псіхалогіі людзей з новым светапоглядам у апавяданні «Дзіўная». Драматызм лёсу Шумавай. Маральная праблематыка, асэнсаванне вечнага і часовага ў творы. М. Зарэцкі – глыбокі псіхолаг” [1]. Зрабіць такі аб’ёмны і складаны матэрыял цікавым і запамінальным, на нашу думку, дапамогуць метады і прыёмы сучасных адукацыйных тэхналогій, найперш тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення і інфармацыйна-камп’ютарных

тэхналогій. Па словах Н. Ярмак, “прымяненне інфармацыйнай тэхналогіі на ўроках неабходна, і матывавана гэта тым, што яна дазваляе эфектыўна арганізаваць групавую і самастойную працу на ўроку, садзейнічае ўдасканальванню практычных уменняў і навыкаў вучняў, дазваляе індывідуалізаваць працэс навучання, павышае цікавасць да вучэбных заняткаў, актывізуе пазнавальную дзейнасць вучняў, развівае творчы патэнцыял вучняў, надае ўроку сучаснасць” [2, с. 376].

Паколькі вучні больш не будуць звяртацца да жыцця і творчасці пісьменніка ў далейшым, на *ўступным этапе* можна выкарыстаць адзін з наступных варыянтаў працы: падаць біяграфічную даведку разам з дэманстрацыяй партрэта пісьменніка або правесці кароткую лекцыю. Настаўнік павінен паведаміць асноўныя этапы жыцця і творчасці М. Зарэцкага, акрэсліць значэнне і ўплыў яго творчасці на развіццё нацыянальнай літаратуры, паказаць жанравую палітру яго твораў (навела, аповесць, сацыяльна-псіхалагічны і гістарычны раман), акрэсліць адметнасці яго мастацкага метаду: “Сярод пануючага рэалізму ў літаратуры пісьменнік адстойваў рамантызм як мастацкі напрамак, які найлепш дазваляе паказаць вобраз рэвалюцыянера ў змаганні з абставінамі лёсу” [2, с. 196]. Важна адзначыць, што М. Зарэцкі быў майстрам псіхалагізму, і праз тэарэтычную даведку акрэсліць змест гэтага паняцця.

У працэсе лекцыі важна зрабіць вобраз пісьменніка жывым, пластычным, цэласным. Для гэтага трэба звярнуцца да цікавых фактаў яго біяграфіі. Да прыкладу, сапраўднае імя пісьменніка – Міхаіл Яўхімавіч Касянкоў. Псеўданім “Міхась Зарэцкі” ён узяў ад вёскі Зарэчча пад Шкловам, дзе прайшло яго дзяцінства. Прычым з ранніх гадоў хлопчык умеў іграць на розных музычных інструментах. Марыў быць святаром. У літаратуру прыйшоў дзякуючы прарочаму сну і г. д.

Для замацавання біяграфіі пісьменніка і актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці дзяцей мэтазгодна звярнуцца да сучасных метадаў, да прыкладу, інтэрактыўнага задання, кшталту “Стварыць акаўнт пісьменніка ў сацыяльнай сетцы”. Намі была абрана знаёмая дзецям сацсетка Вконтакте. Настаўнік разам з вучнямі запаўняюць шапку профіля, затым педагог прапануе старшакласнікам самастойна знайсці іншыя фота пісьменніка ў інтэрнэце, прадумаць статус, які мог бы яскрава характарызаваць М. Зарэцкага, знайсці імёны яго сяброў, напісаць нейкую навіну з жыцця творцы. Пасля гэтая праца франтальна правяраецца, лепшыя прапановы вучняў афармляюцца ў выніковы акаўнт (малюнак 1).




Малюнак 1 – Акаўнт М. Зарэцкага ў сацыяльнай сетцы

Паколькі на ўвесь пералічаны вышэй аб’ём матэрыялу адведзена ўсяго адна гадзіна, то апавяданне чытаецца вучнямі дома, і настаўнік можа адразу прыступаць да *арыенціровачнага* этапа вывучэння мастацкага твора. Акрамя традыцыйнай рэпрадуктыўнай гутаркі па змесце твора і лексічнай даведкі педагогу варта звярнуцца і да сучасных метадычных падыходаў. Прыклады такіх практыкаванняў могуць быць наступныя:

– **Воблака слоў (тэгаў)**: паглядзіце на слайд і выберыце словы, якія суадносяцца з вобразамі галоўных герояў: Блонскага і Шумавай (малюнак 2).




Малюнак 2 – Воблака тэгаў

– **Рашэнне анаграмы** праз QR-код. Анаграма – перастаноўка літар у слове, пры якой атрымліваецца новае слова. Адсканіруйце QR-код, паглядзіце на анаграмы і пераўтварыце іх у правільныя словы, якія суадносяцца з біяграфіяй пісьменніка. Да прыкладу: Зарэцкі, пісьменнік, Дзіўная, Маладняк, Полымя і г. д. (малюнак 3).

Малюнак 3 – QR-код для рашэння анаграм

– Загадзя створаныя настаўнікам **анлайн-гульні** па тэме ўрока, да прыкладу, “Літаратурная скарбонка”. Вучням прапануецца перайсці па спасылцы https://wordwall.net/play/90180/106/455 і ўзгадаць, каму з герояў належыць урывак з тэксту.

На этапе *аналізу* асабліва важна паглыбіць першапачатковае ўспрыняцце тэксту вучнямі, а таму можна прапанаваць *праблемнае пытанне*. Прачытайце пытанне з дошкі. Адкажыце на яго ў пачатку і ў канцы ўрока, зверым вашыя адказы. “Ці была шчаслівай галоўная гераіня апавядання?”

На гэтым этапе мэтазгодным будзе звярнуцца і да прыёму “**Куб пісьменніка**” (інтэрактыўны кубік пытанняў) з мэтай паглыблена прааналізаваць твор, актывізаваць мысленне і маўленне навучэнцаў. Ствараецца куб з шасці гранямі, на кожнай з якіх пазначана пэўнае пытанне ці тып задання для аналізу:

1 Апішы героя, падзею, настрой, абставіны.

2 Параўнай персанажа з іншымі героямі беларускай літаратуры.

3 Патлумач, чаму герой зрабіў пэўны выбар.

4 Уяві, як бы змянілася гісторыя, калі б герой паводзіў сябе інакш.

5 Знайдзі праблему, закранутую ў творы, і яе актуальнасць сёння.

6 Выкажы меркаванне: ці згодны ты з аўтарскай пазіцыяй?

На *заключным* этапе трэба абагульніць вывучанае на ўроку, што можна зрабіць з дапамогай сінквейна, які ўяўляе сабой творчую работу ў форме верша. Ён складаецца з пяці радкоў і не мае рыфмы.

Вучням трэба прапанаваць алгарытм працы над сінквейнам:

1 радок – назва, ключавое слова;

2 радок – два азначэнні;

3 радок – тры дзеясловы;

4 радок – сказ з чатырох слоў, які адлюстроўвае асноўную думку твора;

5 радок – сінонім ключавога слова.

Прыклад сінквейна на тэму “Зарэцкі”:

Зарэцкі

Творчы, мужны

Піша, аналізуе, адлюстроўвае

Стваральнік сацыяльна-псіхалагічнай прозы

Пісьменнік

Паколькі на ўроку, акрамя твора, праграмай прадугледжвалася вывучэнне біяграфіі пісьменніка, то на этапе абагульнення можна прапанаваць рашэнне тэста, які ўключае як звесткі з жыцця Міхася Зарэцкага, так і змест яго твора “Дзіўная”, з дапамогай QR-кода (малюнак 4).

Малюнак 4 – QR-код для рашэння тэставага задання

1 Якое сапраўднае імя Міхася Зарэцкага?

а) Міхаіл Зарэцкі;

б) Міхась Мушынскі;

**в) Міхась Касянкоў;**

г) Міхась Гарадзецкі.

2 У якой вёсцы нарадзіўся пісьменнік?

а) Зарэчча;

**б) Высокі Гарадзец;**

в) Арлоўшчына;

г) Полымя.

3 Што стала штуршком да напісання першага апавядання?

а) вандроўка ў іншае месца;

б) мара пра славу;

**в) яркі сон;**

г) заданне ў школе.

4 Які кірунак у літаратуры адстойваў Зарэцкі?
а) мадэрнізм;
б) натуралізм;
в) рэалізм;
**г) рамантызм.**
5 Якую ролю адыграла літаратурнае аб’яднанне “Маладняк” у жыцці пісьменніка?
а) ён стварыў яго;
**б) быў чальцом і рэдактарам;**
в) крытыкаваў яго;
г) выкладаў там.
6 Якую пасаду займае Блонскі ў аповесці?
а) вучоны;
б) студэнт;
**в) супрацоўнік установы;**
г) інспектар міліцыі.
7 Як Шумава ставіцца да Блонскага напачатку твора?
а) яна яго баялася;
б) яна яго ненавідзела;
**в) яна захаплялася ім і верыла;**
г) яна была абыякавай.
8 У чым асноўная праблематыка твора?
а) вайна і мір;
**б) маральнае і духоўнае знішчэнне чалавека;**
в) гісторыя кахання;
г) нацыянальная самасвядомасць.

Безумоўна, прапанаваны набор прыёмаў не вычэрпвае спіс сучасных метадычных падыходаў да вывучэння абранай намі тэмы. На ўроку можна выкарыстаць шматлікія інтэрнэт-рэсурсы, якія дапамагаюць настаўніку стварыць цікавыя і актуальныя для вучняў заданні з прымяненнем гаджэтаў. Сярод іх – *educaplay.com*, які падыходзіць для стварэння навучальных гульняў; *wordwall.net*, што дапамагае арганізаваць віктарыны, слоўныя гульні і інш.; *kahoot.com* – адукацыйны анлайн-сэрвіс сервіс для канструявання гульняў на хуткасць рашэння; *mohnatus.github.io/filword* для стварэння філвордаў; адукацыйная платформа *joyteka.com* і шмат іншых.

Такім чынам, знаёмства з творчасцю Міхася Зарэцкага ў сучаснай школе адбываецца толькі адзін раз у 10 класе, таму на ўроку мэтазгодна звярнуцца да біяграфічных звестак пісьменніка, а таксама выкарыстаць максімальную колькасць інтэрактыўных заданняў для актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці вучняў, каб гэтае знаёмства было для іх цікавым і запамінальным.

## Літаратура

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для X класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. – URL: https://adu.by/images/2023/08/ bel_lit/up-bel-lit-10-pav.docx (дата звароту: 08.04.2025).

2 Ярмак, Н. В. Інфармацыйныя камп’ютарныя тэхналогіі ў прафесійнай дзейнасці педагога / Н. В. Ярмак // Дыдактыка сеткавага ўрока : матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. онлайн-канф., Мінск, 2–3 снеж. 2021 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. А. Мініч [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 376–380.

3 Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. П. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. А. Акушэвіч, І. Д. Воюш. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 295 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*Р.Барадулін**

***Д. Л. Казлова***

## АКТУАЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ШОСТЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле разглядаецца методыка работы з вершам Рыгора Барадуліна “Уцякала зіма ад вясны…”, які прапанаваны праграмай для вывучэння ў шостым класе. Аўтар адстойвае ідэю неабходнасці напаўнення ўрока беларускай літаратуры сучаснымі прыёмамі і формамі работы, паколькі якасны ўрок быў павінен быць не толькі насычаны інфармацыяй, але і развіваць крэатыўныя здольнасці і крытычнае мысленне навучэнцаў.*

З творчасцю Рыгора Барадуліна па школьнай праграме вучні будуць сустракацца неаднаразова. Упершыню яны пазнаёмяцца з асобай паэта, яго творам у шостым класе. Вывучэнне творчасці Рыгора Барадуліна ў дадзеным класе адбываецца ў раздзеле “Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство”. Вучэбная праграма ў межах тэмы ўрока прапануе разгледзець наступныя аспекты: “Рыгор Барадулін. «Уцякала зіма ад вясны…». Казачна-адухоўлены свет верша. Насычанасць паэтычнай вобразнасці. Роля ўвасабленняў і метафар у стварэнні запамінальнай карціны вясновай прыроды” [1]. Безумоўна, матэрыял, які вучні павінны засвоіць і разабраць на працягу адной гадзіны, немалы, таму будзе дарэчным дадаць да традыцыйных яшчэ і сучасныя метады і прыёмы, у першую чаргу інфармацыйна-камп’ютарныя тэхналогіі, бо яны з’яўляюцца важным інструментам павышэння якасці адукацыі і мадэрнізацыі навучальнага працэсу.

Паколькі вучні толькі пачынаюць знаёміцца з асобай пісьменніка і яго творчасцю, то на *ўступным этапе* настаўнік можа падаць біяграфічную даведку, прадэманстраваць партрэт пісьменніка або паказаць невялічкі відэаролік пра Рыгора Барадуліна. Настаўніку неабходна будзе пазнаёміць вучняў з асноўнымі этапамі жыцця і творчасці пісьменніка, яго паходжаннем, пачаткам літаратурнай дзейнасці, асноўнымі тэмамі і жанрамі. Важна адзначыць, што асаблівасцю яго творчасці была глыбокая любоў да роднай зямлі, гісторыі і мовы, а таксама ўспаміны пра партызанскі рух і цяжкасці вайны. Увядзенне біяграфічнай даведкі пры вывучэнні пейзажнай лірыкі павінна быць метадычна апраўдана, пра што мы агаварымся ніжэй. На дадзеным этапе важна падаць асноўныя звесткі пра пісьменніка, каб у далейшым, пад час знаёмства з іншымі творамі Рыгора Барадуліна, вучні мелі ўяўленне пра жыццё і светапогляд паэта, ведалі агульную інфармацыю пра яго асобу.

Паколькі гэта не паўнавартасная лекцыя па біяграфіі пісьменніка (манаграфічная тэма па яго жыццятворчасці будзе вывучацца толькі ў 10 класе), для замацавання атрыманай інфармацыі настаўнік можа прапанаваць вучням вучням крэатыўнае і займальнае заданне з выбарам фактаў, кшталту “Стварыць акаўнт пісьменніка ў сацыяльнай сетцы”. Зараз эпоха сучасных тэхналогій, людзі актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі, ствараюць акаўнты, таму такое заданне абавязкова спадабаецца вучням, нават і шасцікласнікам. Для яго выканання настаўнік можа прапанаваць вучням стварыць профіль Рыгора Барадуліна ў Instagram, дзе ім патрэбна будзе прыдумаць крэатыўнае і сучаснае імя карыстальніка, апісанне акаўнта, ідэі для пастоў і публікацый. Для гэтага настаўнік можа загадзя падрыхтаваць раздрукаваны профіль, які кожны з вучняў запоўніць самастойна і так, як ён хоча (малюнак 1).